ня йдзі перш за ўсё сам тудой. Вы сьвятлейшые, с паміж сваіх братоў, перш за ўсё самі павярніце на другую дарогу, а за вамі пойдуць і тые, каторые прывыклі хадзіць, кудой іншые ідуць. Даўно вядома, што наш народ верыць не сказу а паказу. Пакажыце-ж, вы сьветачы народу, як трэба паступаць, як трэба жыць. Прызналі вы ў душы і розуме сваім, што пьянства—гэта загуба, то перш за ўсё беражыцеся самі яго, а пасьля, ня крыючы сваей праўды, кажыце яе і іншым.

Да праўды—дарога толькі—праз праўду а не праз фальш. Не карміце-ж фальшам братоў сваіх, каб ня трэба было нарэкаць вам на іх што яны неслухняны.

*Юры Верэшчака.*

## З нашаго жыцьця.

Хто не жыве блізка з нашым вясковым народам, той, праўду сказаўшы, яго не знае. Прыгледзьцеся да яго жыцьця і вы, мой дарагі чытачу, скажэце, што наш беларускі народ самы нешчасьлівы. Цемната яго заедае. Ен так прыбіт векавечнай няволяй, што няможэ, па сваей цемнаце, пачуцца чэлавекам, ня можэ вызваліцца с тых пут, якіе на яго былі сотні гадоў таму накінуты. Дзеля прыкладу возьмем вясельле. Вясельле робіцца зазвычай з гарэлкаю. Маладзік, калі хочэ жаніцца, ідзе да дзеўкі с сватамі і нясе пляшку гарэлкі. Заручыўшыся сагласам дзеўкі, ён набірае колькі гарцоў манапалькі, сазывае ён і яго дзеўка сваякоў, суседзёў і робяць «запоіны». На гэткі банкет с кішэні маладзіка выляціць ад дзесяці да дваццаці рублёў, а то і больш часамі. Калі дзяўчына надта спадабалася дзяцюку, то ён не шкадуе атдаць на запоіны 30—40 рублёў. Гэта робіцца дзеля таго, каб дзеўка пасьля запоін не атказала хлапцу і не звярнула яму страту. Ведама, калі яна бедная, або бацька яе скупы, па няволі выходзіць за нялюбаго дзяцюка. Вясельлі спраўляюць 3—4 дні, а то і цэлы тыдзень: адным швом дзень і ноч, без атпачынку пьюць праклятую атруту. У мужыка с сярэднім дастаткам абходзіцца вясельле 40—50 руб. На яду грошы выходзіць мала; закуска свая: хлеб, цыбуля, соль, кавалак сыра, або сала, чы кумпяка. У заможнаго на гарэлку ідзе 80—100 руб. Хто добра напаіў гасьцей, што аж яны пабіліся, акрывавіліся, і валяліся на вуліцы, то таму пачот і тым гасьцям, што с пабітымі лбамі прышлі дамоў. За вярсту чутно як ў вёсцы бывае вясельле: крык, лаянка, дзікі сьмех, бойка; ўсё гэта напамінае нам старые часы, калі народ быў дзікім. Радзіны, хаўтуры не абойдуцца без пьянства і бойкі. Выежджае хто у Амэрыку, пьюць колькі дзён, прыежджаюць—пьюць пакуль усе грошы прапьюць. Ідзе хто у маскалі, ці прышоў са службы — пьюць. Нават прадажа, ці купля каровы, каня, авечкі, не абходзіцца без барыша. Усюды гарэлка. Наш селянін беларус так зрадніўся з гарэлкаю, што без яе, яму здаецца, ён ня можэ жыць. Папробуйце яму сказаць, што без пьянства можна жыць, што гарэлка шкадліва, то ён пачухаўшы сваю патыліцу скажэ: «Калі яна шкадліва, то нашто начальства пааткрывало па вёсках бухветы? Хіба-ж дзеля атруты мужыкоў?» Гарэлка страшнае зло. Што будзе далей, як падумаеш, што пьюць праклятую гару бяз меры і робяцца пьяніцамі—хворымі пьянствам, атчаго блізка што саўсім нельга вылечыць чэлавека. Пьяніца прапаўшы чэлавек, нешчасьліва яго семья. Гарэлкаю заліваюцца ня толькі мужыкі, але і бабы і малые дзеці. Без абмылкі можна сказаць, што ад агульнаго пьянства людзі пачнуць выраджацца. І цяпер мы ужо бачым па вёсках многа дурнаватых, шмат хваравітых дзяцей, дзяцей тупых да навукі.

Вы, мае брацьця, верные сыны нашай дарагой Беларусі, падумайце, кіньце розумам па галаве, пастанавіце кожны сабе ня піць ніколі гарэлкі. Я ваш брат беларус ад шчыраго сэрца клічу да вас, раджу вам ня піць. Спраўляйце вясельля бяз гэтаго праклятаго трунку. Пашкадуйце свайго здароўя, сваіх дзяцей, свайго дабра. Памятайце, што на вас руйнуючые хвалі набегалі са усіх старон і не затапілі вас. Бярэцеся, каб не затапіла вас атрута—манаполька. У вольны час чытайце кнігі, дзяцей беражыце ад пьянства і не давайце ім гарэлкі, не кампануйце с тымі людзьмі, што гарэлку бяз меры ужываюць, закрывайце прыгаварамі бухветы, тракціры, піўные, а аткрывайце хаўрусные крамы, школы, бальніцы.

Верны сын Беларусі
Стары дзед *Міхась.*

## Конкурс.

Суполка „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ» паведамляе усіх беларускіх пісьменнікоў, што яна абвешчае конкурс сцэнічных твораў.

*Варункі такіе:*

1) Награды назначаюцца тры: 125 р., 50 р. і 25 р., а такжэ пахвальные одзывы за творы не падыйшоўшые на грашавую награду.

2) Аб творах ад'значэных нарадамі будзе апавешчэна у беларускіх часопісях. Фаміліі ці прозвішчы аўтораў, творы каторых не падойдуць пад конкурс, апавешчацца ня будуць.

3) Права ставіць на сцэне адзначэны твор астаецца за аўторам, а права друкавання суполка пакідае сабе.

4) Пры надзеле наградай прысланаго сцэнічнаго твору будзе звертацца увага на такіе асаблівасьці: а) твор не павінен мець недахватоў са стараны літэратурнай, а такжэ ідэёвай; б) павінен быць напісан добрай, г. зн. чыстай беларускай мовай: в) быць прыгодным для пастаноўкі на сцэні. асабліва—на аматорскай у вёсцы, г) тэма можэ быць якая хочучы — бытавая, гістарычная і т. п.; д) форма можэ быць жарту, камэдыі, драмы і т. д., без увагі на тое у сколькі актах і ці прозай ці вершам будзе напісаны.

5) Рэч прысланая на конкурс павінна быць чытэльна перапісанай.

6) На рукапісу павінен быць пастаўлен толькі дэвіз. Фаміліі, прозвішчы і адрэс аўтора пісаць на рукапісу ня можна: гэта ўсё павінна быць прыслана у аддзельным закрытым канвэрце з абазначэньнем пры адрэсе дэвізу і слова «для конкурсу». На пакеці з рукапісам так сама трэба пісаць пры адрэсе—«для конкурсу».

7) У конкурс не прыймаюцца: а) рэчы ужо друкаваные, б) вядомые рэдакціям „М. Б." і „Н. Н.", а такжэ такіе, аўторы каторых ня выпоўняць 6 го параграфу:

8) Судзьдзямі конкурсу будуць: ягомасьці Б. Эпімах-Шыпілло, В. Івanoўскі, А. Новіна і В. Ластоўскі. Гэтые судзьдзі пры разглядзе конкурсных твораў могуць запрасіць па сваей увазе ешчэ каго колечы за судзьдзю. Учасьнікі конкурсу судзьдзямі быць ня могуць.

9) Апошні тэрмін прысылкі рукапісаў 30 сакавіна (марца) 1913 г. Рэзультат конкурсу будзе апавешчэн 31 траўня (мая) 1914 г. Тэрміны гэтые могуць быць прадоўжэны, калі судзьдзі найдуць гэта патрэбным.

10) Пастанова судзьдзяў аб нарадах ні ў якім прыпадку адмененай быць ня можэ.

11) Адрэсаваць рукапісы і пісьмы назначеные для конкурса так: Беларускае Выдавецкае Т-во „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ", С.-Пецярбург, В. О., 4 лінія № 45, кв. 16. Там-жэ можна атрымліваць спраўкі аб конкурсе, калі што з гэтай абвесткі пакажэцца не зразумелым.

Суполка «Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ».

## Аткрыты ліст у рэдакцію „Н. Н.".

Гурток студэнтоў Ново-Александрыйскаго Інстытуту сельскай гаспадаркі паставіў сабе мэту знаёміцца з натуральна-гістарычнымі варункамі нашай Беларусі.

Ведама с першаго часу не абайшлося без прашкод, але пасьля году працы у нас ужо злажылася бібліотэка агранамічнай літэратуры і газэт. Сьведамые агронамы, гаспадары і шчырые грамадзяне атклікаюцца на нашы просьбы і памагаюць нам у нашай працы. Але у адным і ў самым важным, нам не даюць помачы. Я кажу аб тым, што пры вялікай ахвоце працаваць з вясны у маёнтках нашаго краю, нашы таварышы, маладые агронамы, ня могуць знайсці сабе практыку. Не лічыце нас ужо гэткімі панамі, каб мы шмат чаго вымагалі і нічога не рабілі у гаспадарцы. Праўда, мы ешчэ больш тэорэтыкі, але ўсё-ж мы што колечы можэм рабіць: знімаць планы, рабіць аналізы глебы, штучных навозоў, кормоў, збіраць гэрбары (расьлін), уселякіе калекціі, састаўляць раціоны і інш. Апрача таго, ніхто з нас не адрэкаецца ад якой-бы то не было працы у гаспадарцы. Праўда, мы ў першую пару будзем больш вучыцца у практыкоў-гаспадароў, але і ад нас можна дзе чаго навучыцца... Мы добра памятаем, што у нас лепшые маёнткі у руках людзей, каторые мала цікавяцца маладымі сіламі Беларускаго краю і тым мацней мы чэкаем помачы ад тых, хто верыць у будучыну нашай моладзі.

Агрaном-практыкант М. Б.
(Маентак „Пархомоўка", Харкоўск. губ.).

P. S. Звертацца да сэкрэтара сэкціі «Мінчан» п. Рышкевіча. Адрэс у Рэдакціі «Н. Н.».

## Аб усім па троху.

### У Сібір.

Не глядзя на разные перэсьцярогі перэсяленые селян у Сібір не перэстае. А с Сібіру надходзяць ўсё весці аб страшных варунках у якіх павінны жыць перэсяленцы. У Енісейскай губэрні — пяты год ужо неураджай і голад, у Красноярскім і Канскім паветах с пры-

---

задраўшы галаву, доўга стаяў так, выскаліўшы зубы, як бы смеючыся.

— Чаго выскаляешся, воўчае мяса?—сказаў нездавольны Сьцепан і махнуў на бугая рукою. Бык, не апускаючы галавы, адхіліўся і смеяўся столькі, сколькі лічыў гэта патрэбным. Знашоўўшы на шуле каля варот гвозд, Сьцепан павесіў падрызьнікі і пачаў іх разглядаць: браў іх за рукавы і доўга прызіраўся, шоргаў рукою, абціраў пыл і ачышчаў іх. А калі замечаў дзе плямку, то плеваў на яе і моцна шараваў рукавом. Часамі ён адыходзіўся на колькі крокоў, каб пацікаваць, як яно выглядзіць здалёк. Матэрыя хоць куды. Праўда, Сьцепан, купляючы падрызьнікі, і ў думках ня меў які — нібудзь гандаль: проста купіў, уважаючы памяць старога бацюшкі. А як гэта высокае парываньне яго душы крыху улягглося, то Сьцепану само сабою прышло пытаньне, на якую рэч могуць прыгадзіцца яму гэтые падрызьнікі. Гм! на якую рэч? смешна і пытаць: ці ён сам пя здужае насіць іх? От трошкі павузіць рукавы—нават і краўцу ня трэба даваць, надзеў пад халат і насі, здаровы. Каб праверыць гэта Сьцепан зьняў адзін падрызьнік і апрануў. Глянуў на рукавы—і вузіць ня трэба; с пад халата нічога ня будзе відаць. Агледзіўшы рукава, зірнуў на полы—шырокіе на іх ліха. Э! з шырокаго гаўсёды зробіш вузкое... А каровы высунуўшы галовы, пільна глядзелі на Сьцепана і нічога не цямілі тут. Толькі Падласка ні с сяго ні с таго ўзяла ды зарэўла на ўвесь хлеў так, як равуць каровы, убачыўшы рэзьніка. На гэты час міма хлева праходзіў Цырлік і затрымаўся крыху. Ядавіты сьмех скрывіў яго губы і Цырлік сказаў:

— Ой, Сьцепан, як харашэ! Каб цяпер ты стаў на агарод, то не было-бы на сьвеці лепшаго пужала,—і зарагатаў ешчэ сморад!

— Каб табе калом вочы пасталі, абармот ты! Ідзі, ідзі, бо заскую сабакамі.—

Ужо Цырлік адышоўся далёка, а Сьцепан ешчэ доўга гаварыў, якіе круцялі гэтые жыды.

Абапёршыся на загарадку, Сьцепан дастаў люлечку на кароценькім цыбучку, накладаў ў яе махорку і разважаў. Думкі яго вярцеліся каля падрызьнікаў. Ніхто не павінен думаць—мысьліў... Сьцепан,—што яму дыхтавала якая-нібудзь каросць, як ён купляў падрызьнікі. І ня думало быць! А хто ня верыць гэтаму, ніхай праканаецца сам: адзін падрызьнік Сьцепан непрыменна зашле ў сяло свайму нябожу, сястрэнічу Мікалаю. Аддасць краўцу, то такіе выфастрыгуе нагавіцы або світку, што первейшая ў сяле красуня будзе млець па Мікалаю. Толькі ці варта даваць яму? Ешчэ летась ён падстроіў Сьцепану штучку, за каторую прышлося пасьвяціць вачыма. Як роднаго, прыхіліў Сьцепан свайго нябожу, а той на заўтра выцягнуў з варывенькі у бацюшкі бутэльку наліўкі і два скруткі каўбас, як добрые заваратні. Калі каму даваць, то не Мікалаю.

— Дзень добры, дзядзка! як маешся?—

Сьцепан знячэўку аж падскочыў і выпусьціў у гной люльку.

— Бадай ты, Міколка, спрах: так спужаў мяне? Сьцепан і не сцікаваў, як вайшоў той, пра каго ён думаў.

— Што гэта у цябе, дзядзька, вісіць?—спытаў Мікалай.

— Дзе вісіць?—спытаў, нібыто нічога ня ведаючы Сьцепан і дабавіў.

— А! гэта! гэта... так рэч адна.

Мікола зьняў падрызьнік і стаў разглядаць яго.

— Ці ты, дзядзька, хочэш быць паном? на вошта яны табе?

Доўга ня думаючы, Мікалай нацягнуў на сябе падрызьнік. Потым ён, як варьят які, выскачыў на двор і давай круціцца.

Сьцепан узлаваўся.

— Пакінь, Мікола, дурэць! чуеш ты?—крыкнуў Сьцепан і выбег на двор, каб сцягнуць з Мікалая падрызьнік. Мікалай адбегся і давай падражніваццца з дзядзькам. Ды гэтаго мала: ён ешчэ стаў выбрыківаць нагамі, прысядаць і размахіваць падрызьнікамі, як крыльлямі. Сьцепан вышаў с цярпеньня і давай лавіць Мікалая. Ды дзе ты дагоніш яго, калі ён вёрткі, як чорт. Хіба прыперці да плоту? Але і платоў яму німа, каб ён апруцянеў! Як раз на тое ліха Зося заярыла с кухні сабак. Убачыўшы незнаёмаго хлопца і Сьцепана, каторы за ім ганяўся, пакрыўджэные і злые сабакі с трох бакоў кінуліся на Мікалая. Мікалай выламаў с плоту кол і давай ваеваць с сабакамі. А яны так і лезуць сляпіцэю. Адзін з іх злаўчыўся і схапіў Мікалая ззаду за падрызьнік. Падняўся страшны гаўк, крык. Выскачыла Зозя с кухні, матушка с пакоеў; з за вугла высунулася галава Шлёмы Цырліка. Мікалай вылузаўся с падрызьніка, прысланіўся да вяза і адмахіваўся калом

